Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№146 (28510)
2 жніўня 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



«Другое дыханне» Аршаншчыны
МС



Вобраз вёскі будучыні
МС



Нашы гарады пазелянеюць
МС

## Вушаста-пухнатая гаспадарка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Трохгадовая Каця КУЗЬМІЧ з вёскі Дзікева Шаркаўшчынскага раёна і яе гадаванцы.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«Эфектыўнасць праведзення мытных аперацый паспрыяла павелічэнню ў першым паўгоддзі 2017 года аб'ёму транзітных тавараў, што перамяшчаюцца праз мытную мяжу ЕАЭС у Рэспубліку Беларусь, на 22 працэнты».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9401 | ▼ |
| Еўра | 2,2924 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0749 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Ва ўрадзе

## ЭКАНОМІКА НА ШЛЯХУ РОСТУ

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ падчас пашыранага пасяджэння Савета Міністраў адзначыў, што ў эканоміцы краіны захоўваецца тэндэнцыя росту. З сямі найважнейшых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця цяпер выконваецца шэсць.**

### АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ПЛАН

На пасяджэнні былі разгледжаны вынікі работы эканомікі краіны за першае паўгоддзе і дадатковыя меры па выкананні пастаўленых сёлета задач. Прэм'ер-міністр адзначыў, што існуючы паказчык ВУП у 101% да студзеня—чэрвеня 2016 года вышэй, чым першапачаткова планавалася. «Больш высокімі тэмпамі, чым ВУП, расце прадукцыйнасць працы — 102,7% за пяць месяцаў. Забяспечаны баланс у знешнім гандлі. Сальда за пяць месяцаў склала больш за 265 млн долараў — плюс 1,3% да ВУП», — паведаміў ён. Прэм'ер-міністр таксама падкрэсліў, што зніжаецца ўплыў манетарных фактараў на інфляцыю, якая за шэсць месяцаў склала 3,4% пры прагнозе — не больш за 6,7%. Гэта самая мінімальная інфляцыя за апошнія 10 гадоў.

СТАР. 2

■ З нагоды

## ПАДПІСАНА ДА ДРУКУ

З якімі думкамі адзначае 90-годдзе «Советской Белоруссии» яе галоўны рэдактар

**Інтэрв'ю з галоўным рэдактарам газеты «СБ. Беларусь сегодня» («Советская Белоруссия») Паўлам ЯКУБОВІЧАМ атрымалася нашмат шырэйшым, чым «з нагоды». Хоць нагода якраз і была досыць значная — юбілейная: акурат 2 жніўня 1927 года пабачыў свет першы нумар газеты «Рабочы», якая хутка памяняла сваё імя на «Советскую Беларусь» і якой праз дзесяцігоддзі наканавана было стаць самай уплывовай газетай незалежнай краіны... Зрэшты, нічога дзіўнага. Бо розныя круглыя даты, юбілеі ў нашай журналісцкай справе — перш за ўсё нагода паразважаць, для каго працуем, наколькі эфектыўна, у якіх стасунках з грамадствам, якое яно, гэта грамадства, сёння, ці можам мы ўплываць на яго думкі, што мы можам зрабіць карысная для краіны, у якой жывём, для людзей, якія нас чытаюць... І разважаць пра гэта мой паважаны суразмоўнік пачаў ужо з першага пытання, якое задавалася акурат як «юбілейнае».**

**— Павел Ізотавіч, калі б сёння вам прапанавалі напісаць пра «Советскую Белоруссию» артыкул для сур'ёзнага аналітычнага часопіса або, скажам, для падручніка па гісторыі журналістыкі, прымеркаваны да 90-годдзя газеты, на чым бы вы найперш засяродзілі ўвагу і як бы яго назвалі?**

— Калі пісаць да 90-годдзя ў так званым «дацкім» (прымеркаваным да даты) жанры, для творчасці месца будзе малавата, гэта быў бы цалкам прадказальны артыкул — расповед пра слаўны шлях, пра людзей, якія закладвалі падмурак... Увогуле, пра гісторыю такіх газет як «Звязда і «Советская Белоруссия» можна гаварыць і пісаць шмат, не баючыся нейкай пафаснасці. Таму што 90 гадоў — гэта 90 гадоў гісторыі краіны Беларусь — савецкай, а цяпер незалежнай, сучаснай. Гэта калейдаскоп падзей, якія складана нават у рэтраспектыве падагнаць пад нейкую агульную канцэпцыю.

У нашага народа гістарычны лёс увогуле вельмі складаны і непадобны на лёс нават самых бліжэйшых суседзяў. Наша гісторыя ішла сваімі, няпростымі, часам вельмі пакручастымі сцежкамі. Нават тыя факты, якія змяшчаюць падручнікі гісторыі, выклікаюць часам супярэчнасці.

СТАР. 4

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 7 дзён

На ўсе 100!!!
100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна.
Заставайцеся з намі – будзе цікава!
Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.